

ДЫЗАЙН МУЛЬТЫМЕДЫЯ І МІКРАБІЯЛОГІЯ

ЧЫРВОНКА

У ШКОЛЕ МОЖНА ЦАЛКАМ РЭАЛІЗАВАЦЬ СЯБЕ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 108 (29988)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:**

*«Сёння Захад разумее, што прайграе санкцыйную вайну, якую вядзе супраць Беларусі. І каб апраўдаць свае незаконныя дзеянні, уцягнуць у гэтую брудную гульню іншыя краіны, спрабуе выкарыстоўваць пляцоўку Міжнароднай арганізацыі працы. Гэта абсурд поўны. Міжнародная арганізацыя працы, па сваёй сутнасці, павінна абараняць занятасць і даходы людзей. Для гэтага яна створана гістарычна. А сёння заходнікі спрабуюць працягнуць праз гэтую арганізацыю рашэнне, якое накіравана на тое, каб пакінуць людзей без работы і без зарплаты... Прафсаюзы больш як сотні краін, якія ўваходзяць у Сусветную федэрацыю прафсаюзаў, калектыўна выступілі катэгарычна супраць прымянення якіх-небудзь абмежаванняў, але такая пазіцыя мільёнаў працоўных не проста праігнараваная. Яна хаваецца і замоўчваецца. Робіцца ўсё для таго, каб паказаць, што нібыта працоўныя ўсяго свету падтрымліваюць МАП у дадзеным пытанні. Гэта абсалютна не так. Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што справа супраць Беларусі — маніпуляцыя думкай і фальсіфікацыя».*

# Бліжэй да Неба



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Малады спецыяліст па мантажы смальтавай мазаікі мінчанка Наталля ЛАЗАРЭВІЧ удзельнічае ва ўпрыгожванні званіцы Богаяўленскага храма, які ўзводзіцца на ўскрайку сталічнага мікрараёна Лошыца.**

Па палічках

## БАЛЬНІЧНЫЯ БУДУЦЬ ЛІЧЫЦЬ ПА-НОВАМУ

### Як зменяцца іх памеры?

**З будучага года змяняецца парадак налічэння бальнічных. І тут ёсць некалькі істотных змяненняў. Найперш мінімальная выплата па бальнічным вырасце ў тры разы. Гэта актуальна для тых работнікаў, якія выплачвалі ўзносы ў ФСАН менш за шэсць месяцаў, бо ў іх асобны парадак падліку дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Для тых, у каго стаж работы складае дзесяць і больш гадоў, 100 % сярэднядзённага заробку будзе налічвацца з першага дня бальнічнага. Для астатніх — 80 %. А перыяд для падліку сярэднядзённага заробку вырасце з шасці да 18 месяцаў.**

### 2,2 МІЛЬЯРДА НА ВЫПЛАТУ

Як адзначыла **кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА**, з 1 студзеня 2024 года чакаецца шэраг навацый па пытаннях прызначэння і выплаты дапамог па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах. У 2022 годзе на выплату ўсіх відаў дапамог з бюджэту фонду было накіравана 4,4 мільярда рублёў, што складае каля 21 % у расходнай частцы бюджэту фонду.



СТАР. 2

Клімат

## НА ХВАЛІ СПЁКІ

### Нас папярэджваюць аб экстрэмальных тэмпературах ужо гэтым летам

**У найбліжэйшыя пяць гадоў глабальныя тэмпературы могуць павысіцца да рэкордных узроўняў, чаму будуць спрыяць парніковыя газы і натуральная гарачая з'ява Эль-Ніньё, адзначаецца ў новым бюлетэні Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА). Як гэта закране жыхароў нашага паўшар'я і нашай краіны?**

### ТРЫ МЕСЯЦЫ НА МАКСІМУМЕ

Спачатку мы разбяромся з тым, якое нас чакае надвор'е ў бягучым сезоне. Як правіла, да такіх прадказанняў на тры месяцы, на думку экспертаў, варта ставіцца вельмі асцярожна. Значыць...

Сёлетняе лета ў Беларусі будзе гарачэйшае, чым звычайна. Пра гэта сведчаць даныя аднаго замежнага інстытута метэаралогіі і воднай гаспадаркі. Наколькі павысіцца сярэдняя тэмпература і што кажуць прагнозы метэаролагаў пра ападкі?



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СТАР. 4

КОРАТКА

- **Фізасобы ў Беларусі ў маі прадалі на $142,6 млн валюты больш, чым купілі.**
- Брэсцкі гарвыканкам выдзеліў дадаткова Br1,3 млн на рамонт сельскіх ФАПаў і гарбальніц.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!